УДК 930(476)(477)

**В. У. Коваль**, кандыдат гістарычных навук, асістэнт (БДТУ)

# ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД ДАСЛЕДАВАННЯЎ МІЖВАЕННАЙ БЕЛАРУСКАЙ І ЎКРАІНСКАЙ ДЫЯСПАР

Дадзеная публікацыя прысвечана агляду асноўных даследаванняў па гісторыі беларускай і ўкраінскай дыяспар у міжваенны час. У ёй прааналізаваны малавядомыя ў беларускай гістарыяграфіі працы замежных вучоных. Аўтарам зроблена ўласная класіфікацыя беларускіх, украінскіх, рускіх, польскіх, англійскіх публікацый, якія прысвечаны вывучэнню эміграцыйных хваляў. Асобная ўвага надаецца даследаванню палітычнага, эканамічнага, культурнага супрацоўніцтва паміж беларускімі і ўкраінскімі эмігрантамі. Аўтар адзначае, што адным з важнейшых фактараў, якія значна паўплывалі на фармат адносін у пазначаны перыяд, сталі культурныя ўзаемасувязі і агульныя гістарычныя карані беларускай і ўкраінскай нацый.

The article characterizes the main researches about Belarusian and Ukrainian diasporas in the interwar period. It analyzes the little-know in Belarus materials and publications of foreign historians. The author is the first to make an original classification of Belarusian, Ukrainian, Russian, Polish, English publications about the emigration waves. Special attention is given to the characteristic of political, economic, cultural cooperation between Ukrainian and Belarusian emigrants. The author points out that one of the significant factors which affected the relations format within the stated period was the cultural trade and the common history of Belarusian and Ukrainian nations.

**Уводзіны.** Тэма фарміравання і дзейнасці беларускай эміграцыі сёння з’яўляецца актуальнай і запатрабаванай. У апошнія гады колькасць манаграфій і артыкулаў па дадзенай тэме ў Беларусі значна павялічылася, аднак пры аналізе публікацый па гісторыі беларускай дыяспары становіцца відавочна, што далёка не ўсе аспекты палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця беларусаў замежжа вывучаны і даследаваны. Да таго ж даволі часта ацэнкі аўтараў навуковых работ па беларускай эміграцыі выключна суб’ектыўныя, некаторыя даследчыкі абапіраюцца не на гістарычныя крыніцы, а на свае ўласныя перакананні і меркаванні.

Асаблівую ўвагу пры вывучэнні беларускага замежжа неабходна надаваць міжнародным узаемакантактам эмігрантаў, іх культурнаму, эканамічнаму і палітычнаму супрацоўніцтву, што дазволіць больш падрабязна прадставіць гісторыю міжваеннай дыяспары. Пры фарміраванні палітычных інстытутаў, культурных асяродкаў і грамадскіх аб’яднанняў беларускіх эмігрантаў значную падтрымку і дапамогу аказвала больш кансалідаваная і колькасная ўкраінская дыяспара. Супрацоўніцтва паміж беларусамі і ўкраінцамі развівалася ў розных краінах свету не толькі ў асяродку палітычных эмігрантаў, але і сярод прадстаўнікоў эканамічнай эміграцыйнай хвалі.

**Асноўная частка.** Аспекты развіцця і тэндэнцыі фарміравання працоўнай і палітычнай эміграцыі беларускага насельніцтва ў міжваенны перыяд сёння распрацаваны недастаткова. Для шырокага вывучэння дадзенай тэмы даследчыкам не хапае гістарычных крыніц, асабліва вузкая крыніцазнаўчая база беларускай эканамічнай хвалі. Шэраг матэрыялаў па гісторыі беларускай эміграцыі захоўваецца ў замежных архівах, цэнтрах і бібліятэках, таму яшчэ не выкарыстоўваецца гісторыкамі ў поўнай ступені.

Падчас аналізу ўкраінскай гістарыяграфіі па пытаннях развіцця дыяспары ў міжваенны перыяд неабходна падкрэсліць высокі ўзровень распрацаванасці прадстаўленай тэмы. Украінскія гісторыкі больш грунтоўна вывучаюць асаблівасці фарміравання эміграцыйных хваляў, дзейнасць палітычных цэнтраў і аб’яднанняў замежжа, развіццё адукацыйных устаноў на Захадзе, дэталёва даследуюць біяграфіі вядомых украінскіх эмігрантаў.

У працэсе вывучэння ўзаемасувязяў беларускага і ўкраінскага замежжа міжваеннага часу былі выкарыстаны апублікаваныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі, бібліятэцы Варшаўскага ўніверсітэта, Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы, Львоўскай нацыянальнай навуковай бібліятэцы Украіны імя В. Стэфаніка, Навуковай бібліятэцы Львоўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя І. Франка, Нацыянальнай бібліятэцы Украіны імя В. І. Вярнадскага, бібліятэцы Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў у Маскве.

Апублікаваныя матэрыялы, на падставе якіх можна зрабіць выснову пра беларуска-ўкраінскія сувязі замежжа, падзяляюцца на тры групы:

– публікацыі беларускіх гісторыкаў пра фарміраванне міжваеннай эміграцыйнай хвалі;

– даследаванні ўкраінскіх вучоных пра дзейнасць эканамічных і палітычных украінскіх эмігрантаў;

– публікацыі аўтараў далёкага замежжа і Расіі, у якіх адлюстроўваюцца новыя тэарэтычныя распрацоўкі вывучэння гісторыі эміграцыі.

Актыўнае вывучэнне тэмы гісторыі беларускай дыяспары пачалося пасля распаду Савецкага Саюза. У большасці навуковых работ беларускіх аўтараў у 90-я гг. ХХ ст. падкрэсліваюцца выключна станоўчыя моманты ў мінулым замежжа. Аднак у пачатку ХХІ ст. да дадзенай тэмы губляецца зацікаўленасць спецыялістаў, яе пачынаюць лічыць праблемнай, спрэчнай і нават палітызаванай.

На сённяшні дзень асаблівасці эміграцыйных хваляў і мінулае беларускай дыяспары зноў у цэнтры ўвагі гістарычнага даследавання. Вывучэнне дадзенай тэмы патрабуе асвятлення шырокага кола пытанняў, якія належаць да розных галінаў гуманітарных ведаў – не толькі да гісторыі, але і да паліталогіі, сацыялогіі, этнаграфіі, філалогіі, філасофіі і г. д. Яшчэ вялізная колькасць матэрыялаў засталася па-за ўвагай вучоных, многія аспекты жыцця беларускай эміграцыі фактычна пакуль не даследаваны, вядзецца работа па пошуку гістарычных крыніц у архівах і бібліятэках Рэспублікі Беларусь і замежжа.

Што датычыцца сучасных дысертацыйных работ па гісторыі беларускай эміграцыі, то іх вельмі мала. Кандыдацкая дысертацыя С. В. Шабельцава прысвечана пытанням беларуска-ўкраінскіх кантактаў у Аргенціне з 1945 па 1991 гг [1]. Аўтар на высокім навуковым узроўні вылучае тэндэнцыі развіцця сувязяў беларусаў і ўкраінцаў за мяжой, даследуе іх палітычнае і культурнае жыццё, намагаецца разабрацца ў пытаннях адаптацыі эмігрантаў. Нягледзячы на тое, што работа прысвечана пасляваеннаму перыяду, С. В. Шабельцаў піша пра агульныя беларуска-ўкраінскія праекты, якія былі распрацаваныя яшчэ да Другой сусветнай вайны, але рэалізаваныя значна пазней.

Яшчэ адна айчынная дысертацыйная праца М. І. Чмаравай «Беларуская літаратура ў Чэхаславакіі (1920–1945)» прысвечана літаратурнай спадчыне беларускага замежжа [2]. Работа выканана не толькі на аснове беларускіх матэрыялаў, у ёй таксама выкарыстаны даследаванні сучасных чэшскіх і ўкраінскіх літаратуразнаўцаў і гісторыкаў. Даследаванне М. І. Чмаравай уяўляе сабой глыбокую навуковую працу па гісторыі беларускай літаратуры і выдавецкай справы ў міжваеннай Чэхаславакіі. Аўтар спрабуе вылучыць асноўныя рысы і сфармуляваць агульныя тэндэнцыі развіцця беларускага культурнага асяроддзя ў Празе, падкрэслівае шырокую арганізацыйную дапамогу ўкраінскай дыяспары.

Найбольш вывучаным пытаннем у гісторыі міжваеннай беларускай эміграцыі з'яўляецца дзейнасць дыяспары ў Чэхаславакіі. Менавіта ў Празе беларусы разгарнулі актыўную палітычную, культурную, арганізацыйную, адукацыйную і творчую работу. Дзейнасці беларускіх эмігрантаў у міжваеннай Чэхаславакіі прысвечаныя навуковыя артыкулы У. Ляхоўскага [3], Л. Мірачыцкага [4], М. Труса [5]. Па іх матэрыялах можна прасачыць асобныя лёсы беларусаў у Чэхаславакіі, вызначыць ролю палітычнага эміграцыйнага цэнтра ў Празе для ўсёй беларускай міжваеннай эміграцыі, суаднесці ступень дапамогі і ўплыву з боку іншых славянскіх дыяспар, у тым ліку ўкраінскай.

Пры вывучэнні эканамічнай эміграцыйнай хвалі з тэрыторыі Заходняй Беларусі асаблівай увагі заслугоўваюць даследаванні Я. Мірановіча [6] і В. Мярчук [7], у якіх падрабязна апісана эканамічнае і палітычнае становішча беларускіх сялян у Другой Рэчы Паспалітай, іх планы на заробкі за мяжой, арганізацыя польскімі ўладамі эміграцыйнага руху і перспектывы эмігрантаў.

Гістарычную карціну міжваеннага часу дапаўняюць работы польскіх гісторыкаў па развіцці «ўсходніх крэсаў». Падрабязнымі і грунтоўнымі працамі з'яўляюцца манаграфіі польскага даследчыка, спецыяліста па нацыянальным пытанні ў міжваенны час І. Тамашэўскага [8]. Выкарыстанне не толькі беларускіх, але і польскіх навуковых даследаванняў па пытанні развіцця нацыянальных меншасцяў Другой Рэчы Паспалітай дазваляе пазбегнуць радыкальных ацэнак мінулага, а таксама скажэнняў гістарычных фактаў.

Узнавіць гістарычную карціну эканамічнай і палітычнай міжваеннай хвалі ўкраінцаў, падрабязна і дэталёва разгледзець мінулае замежжа дазваляюць публікацыі сучасных украінскіх гісторыкаў. Некаторыя ўкраінскія спецыялісты звяртаюцца таксама да аспектаў развіцця беларускай дыяспары.

Важным пытаннем мінулага міжваеннай украінскай эміграцыі з'яўляецца працоўная эміграцыйная хваля жыхароў Заходняй Украіны, якую падрабязна даследаваў у сваіх публікацыях прафесар С. П. Качараба. Яго навуковыя работы глыбока асвятляюць дзейнасць і мэты эміграцыйных органаў Польшчы, асаблівасці наладжвання побыту эмігрантаў за мяжой, работу карабельных таварыстваў і іх агентаў. Манаграфія С. П. Качарабы «Эміграцыя з Заходняй Украіны 1919–1939» [9] прысвечана нацыянальнай палітыцы польскага ўрада на заходнеўкраінскіх землях, эміграцыйнаму заканадаўству Польскай дзяржавы, фарміраванню асноўных кірункаў украінскай эміграцыі ў міжваенны час. Высновы даследаванняў вучонага таксама карысныя для вывучэння беларускай эканамічнай хвалі з тэрыторыі Другой Рэчы Паспалітай.

Вядомым спецыялістам па палітычнай украінскай эміграцыі з'яўляецца прафесар У. П. Трашчынскі. У сваіх публікацыях ён падрабязна апісвае сацыяльны склад палітычнай міжваеннай эміграцыі ў розных краінах свету, асаблівасці фарміравання асноўных палітычных цэнтраў, узаемадзеянне ўкраінцаў замежжа з уладамі краін-рэцыпіентаў. Манаграфія У. П. Трашчынскага «Міжваенная ўкраінская эміграцыя ў Еўропу як гістарычная і сацыяльна-палітычная з'ява» [10] прысвечана даследаванню асноўных эмігранцкіх партый, грамадскіх аб'яднанняў і палітычных блокаў у Заходняй Еўропе.

Шырока распрацаванай тэмай украінскай гістарыяграфіі з'яўляецца мінулае эмігрантаў у міжваеннай Чэхаславакіі. Актыўная ўкраінская дыяспара пакінула там багатую навуковую, творчую і культурную спадчыну. Украінскія навучальныя ўстановы ў Празе ператварыліся ў буйныя навуковыя цэнтры, дзе выкладалі сусветна вядомыя вучоныя, а нацыянальныя харавыя, мастацкія і творчыя калектывы Чэхаславакіі былі папулярнымі не толькі ў Еўропе, але і ў краінах Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі.

Адным з першых да тэмы дзейнасці ўкраінскай супольнасці ў Чэхаславакіі звярнуўся на пачатку 1990-х гг. гісторык С. Віднянскі [11]. Даследаваннем украінскага студэнцкага і маладзёжнага руху эміграцыі займаліся таксама О. Дуднік [12] і В. Галавенка [13]. Украінскія аўтары не толькі апісалі плённую працу эмігрантаў, але і пазначылі важнасць узаемаўплываў культурных традыцый іншых народаў, у тым ліку і беларусаў замежжа, пры захаванні самаідэнтычнасці ўкраінскай супольнасці ў Чэхаславакіі.

Каштоўнай гістарычнай крыніцай па вывучэнні беларуска-ўкраінскіх кантактаў у эміграцыі з'яўляецца першая частка кнігі ўкраінскага эмігранта Сымона Нарыжнага «Украінская эміграцыя. Культурная праца ўкраінскай эміграцыі паміж дзвюма сусветнымі войнамі» [14], выдадзеная ў 1942 г. у Празе. Праца С. Нарыжнага створана на аснове шырокай музейна-крыніцазнаўчай базы. У манаграфіі гісторык неаднаразова звяртаў увагу на супольную дзейнасць беларускай і ўкраінскай дыяспар. Даследаванне С. Нарыжнага, праведзенае ў міжваенны перыяд, абапіраецца на каштоўныя гістарычныя крыніцы, большасць якіх аднавіць на сённяшні дзень немагчыма.

Другую частку кнігі С. Нарыжнага «Украінская эміграцыя. Культурная праца ўкраінскай эміграцыі 1919–1939» [15] выдалі сучасныя архівісты і дакументазнаўцы адносна нядаўна. У 1999 г. быў апублікаваны рабочы матэрыял працы ўкраінскага эмігранта С. Нарыжнага: кіеўскія архівісты сабралі незавершаную частку манаграфіі фактычна па ўрыўках. Вывучэнне дзейнасці ўкраінскай дыяспары аўтарам значна пашырыла ўяўленні гісторыкаў пра міжваенны час, таму выкарыстанне пазначаных матэрыялаў карыснае таксама для беларускіх, чэшскіх, расійскіх даследчыкаў. Увядзенне манаграфій С. Нарыжнага ў беларускі навуковы зварот дазволіць пазбегнуць шматлікіх стэрэатыпаў і штампаў пра эміграцыю.

Новым аспектам даследавання беларускага замежжа з'яўляецца вывучэнне асноўных паняццяў і дэфініцый тэмы. У тэарэтычным плане пры ўдакладненні тэрмінаў і фармулёвак карыснымі з'яўляюцца заходнія даследаванні. Акрамя таго, каштоўнымі работамі па тэорыі фарміравання дыяспар і метадалогіі навуковых падыходаў пры вывучэнні эміграцыйных працэсаў сталі публікацыі расійскіх аўтараў. Выкарыстанне вопыту асноўных расійскіх і замежных цэнтраў па даследаванні эміграцыі дазволіць вызначыць асноўныя дэфініцыі дыяспаральнасці гісторыі беларускай дыяспары.

Манаграфія Нікаласа ван Хіяра «Новыя дыяспары» [16] – гэта сучасны навуковы погляд заходняй гістарыяграфіі на міграцыйныя працэсы ў XX ст. У рамках даследавання буйнейшых у свеце дыяспар, іх ментальнасцяў, асаблівасцяў пражывання, тэндэнцый развіцця англійскі аўтар таксама разглядае і эміграцыю з тэрыторыі Савецкага Саюза. Асобна падаюцца характарыстыкі сучасных беларускай і ўкраінскай дыяспар. Дадзенае даследаванне з'яўляецца актуальнай тэарэтычнай работай, а пазіцыі заходняга аўтара пашыраюць уяўленні пра ролю эмігрантаў і іх дыяспар у гістарычным развіцці Еўропы, Афрыкі, Сярэдняй Азіі.

Асаблівай увагі заслугоўваюць расійскія публікацыі па развіцці этнічных дыяспар В. Д. Папкова [17] і аналізе ролі дыяспар у жыцці метраполіі А. Б. Ручкіна [18]. Вядучыя расійскія тэарэтыкі дыяспаральнасці ў сваіх работах акрэсліваюць асноўныя паняцці, якія неабходна шырока прымяняць пры вывучэнні гісторыі беларускай і ўкраінскай эміграцыі. Расійскі і замежны вопыт значна ўзбагачае ўяўленні пра асноўныя працэсы адаптацыі эмігрантаў, іх узаемакантакты з прадстаўнікамі іншых дыяспар і аўтэхтонным насельніцтвам.

**Заключэнне.** Такім чынам, на сённяшні дзень тэма гісторыі беларускай дыяспары з'яўляецца запатрабаванай і актуальнай, аднак пры яе даследаванні нямала пытанняў яшчэ патрабуюць удакладнення і аналізу спецыялістаў. У сучаснай беларускай акадэмічнай навуцы ўзнікла вострая патрэба ў стварэнні грунтоўнага даследавання па дадзенай тэме. Пры вывучэнні беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва асаблівую цікавасць выклікаюць украінскія матэрыялы

па гісторыі эканамічнай і палітычнай эміграцыйных хваляў, дзе нярэдка ўспамінаецца пра агульныя з беларусамі замежжа праекты і мерапрыемствы. Акрамя таго, для падрабязнага вывучэння беларускай эміграцыі і ўзаемасувязяў дыяспар неабходна ўжываць новы тэрміналагічны апарат дыяспаральнасці, які шырока распрацаваны ў англамоўных публікацыях і манаграфіях сучасных расійскіх аўтараў.

### Літаратура

1. Шабельцев, С. В. Украинцы и белорусы в Аргентине: общественно-политическая деятельность и связи с родиной (1945–1991 гг.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.03 / С. В. Шабельцев. – Минск: БДУ, 2005. – 116 с.

2. Чмарава, М. І. Беларуская літаратура ў Чэхаславакіі (1920–1945): дыс. … канд. філал. навук: 10.01.01; 10.01.03 / М. І. Чмарава. – Мінск: БДУ, 2002. – 113 с.

3. Ляхоўскі У. Грамадска-культурная чыннасць беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг. / У. Ляхоўскі // Общественно-культурная жизнь белорусской и российской эмиграции в Чехословакии 1921–1938. Каталог выставки в Национальном музее истории и культуры Беларуси с 27 мая по 3 июля 2002 г. – Минск: Новопринт, 2002. – С. 21–31.

4. Мірачыцкі, Л. Беларуская інтэлігенцыя на эміграцыі і чэшскае нацыянальнае адраджэнне / Л. Мірачыцкі // Беларусіка = Albaruthenica. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – Кн. 5. – С. 111–115.

5. Трус, М. Даўні сябра беларускага народа. Невядомыя лісты ўкраінскага гісторыка Дзмітра Дарашэнкі / М. Трус // Роднае слова. – 2009. – № 5. – С. 10–14.

6. Мірановіч, Я. Навейшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч. – Беласток: Niwa, 1999. – 270 с.; Mironowicz, E. Białorusini i Ukraińcy w polityce obozu piłsudczykowskiego / E. Mironowicz. – Białystok: Wyd-wo Uniwersyt. Trans Humana, 2007. – 294 s.; Mironowicz, E. Polityka narodowościowa PRL / E. Mironowicz. – Białystok: Wydanie Białorusk. T-wa Hist., 2000. – 284 s.

7. Мярчук, В. М. Адміністрацыйна-прававыя асновы эміграцыі з тэрыторыі Заходняй Беларусі / В. М. Мярчук // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2009. – № 4. – С. 141–148.; Мярчук, В. Ажыццяўленне эміграцыі з тэрыторыі Палескага ваяводства (1920–1930-я гг.) / В. Мярчук // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – Białystok, 2010. – № 32. – S. 101–115.

8. Tomaszewski, J. Mniejszości narodowe w Polsce XX wieku / J. Tomaszewski. – Warszawa: Spotkania, 1991. – 58 s.; Tomaszewski, J. Polska w Europie i świecie 1918–1939 / J. Tomaszewski, Z. Landau. – Warszawa: Wyd-wo TRIO, 2005. – 335 s.

9. Качараба, С. П. Еміграція з Західної України 1919–1939 / С. П. Качараба. – Львів: Львівський національний університет імені Івана Франка, 2003. – 416 с.

10. Трощинський, В. П. Міжвоєнна українська еміграція в Європі як історичне і соціально-політичне явище / В. П. Трощинський. – Київ: Ітел, 1994. – 260 с.

11. Віднянськйй, С. В. Культурно-освітня і наукова діяльність української еміграції в Чехо-Словаччині: Український вільний університет (1921–1945 гг.) / С. В. Віднянськйй. – Київ: Нац. акад. наук України, 1994. – 82 с.

12. Дуднік, О. Я. Український студентський рух в еміграції (Центрально-Східна Європа, 20-ті роки ХХ ст.): автореф. дис. … канд. істор. наук: 07.00.02 / О. Я. Дуднік; Ін-т укр. археографії та джерелознавства ім. М. С. Грушевського НАН України. – Київ, 2003. – 20 с.

13. Головенько, В. Молодіжний рух української діаспори / В. Головенько // Українська діаспора. – Київ: Інтел, 1994. – Число 6. – С. 70–78.

14. Наріжний, С. Українська еміграція. Культурна праця української еміграції між двома світовими війнами / С. Наріжний. – Прага: Музеї визвольної боротьби України, 1942. – 372 с.

15. Наріжний, С. Українська еміграція. Культурна праця української еміграції 1919–1939 (матеріали, зібрані С. Наріжним до частини другої). – Київ: Видавництво імені Олени Теліги, 1999. – 272 с.

16. Hear, N. van. New diasporas. The mass exodus, dispersal and regrouping of migrant communities / N. van Hear. – Oxford: University of Oxford, 1998. – 298 p.

17. Попков, В. Д. Феномен этнических диаспор / В. Д. Попков. – М.: ИС РАН, 2003. – 340 с.

18. Ручкин, А. Б. Русская диаспора в Соединенных Штатах Америки в первой половине ХХ века. – М.: Нац. ин-т бизнеса, 2006. – 464 с.

*Паступіла 15.03.2012*